



# СЯБАР НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

Сябрам чалавека называе кнігу народная мудрасць, а ў дом, дзе жыве сапраўдны сябар, дзверы заўжды гасцінна адчынены. Амаль паўтары тысячы чалавек прыходзяць штодзень у Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У. І. Леніна. На працягу больш чым пяцідзесяці гадоў яна з'яўляецца самай вялікай бібліятэкай рэспублікі і адной з буйнейшых у краіне. Тут зроблена ўсё, каб чытач — школьнік, студэнт ці вучоны — меў магчымасць хутка атрымаць патрэбную літаратуру. Але не толькі кнігамі поўняцца паліцы, тут «прапісаны» альбомы і грампласцінкі, патэнты і камплекты часопісаў, ноты і газеты — усяго больш за пяць мільёнаў. Сярод кніг ёсць веліканы, вага якіх вылічваецца дзесяткамі кілаграмаў. Самыя маленькія кнігі лёгка памесцяцца ў запалкавай каробцы.

Дванаццаць чытальных залаў бібліятэкі запрашаюць на сустрэчу з сябрам!

**Я. ПЯСЕЦКІ.**

**На здымках:** 1. На электрычным табло загарэўся нумар, чытача чакаюць заказаныя кнігі. 2. У сектары рэдкай і старадрукаванай кнігі працуюць загадчыца сектара Я. Анціпава і старшы бібліятэкар Н. Кушнярова. 3. У вялікай чытальнай зале бібліятэкі.

